- авансаванне даверам (у калектыве ствараюцца спрыяльныя ўмовы
- для прыняцця рашэнняў і іх выканання, калі кожнаму чалавеку аказваецца максімальны давер – яго патэнцыялу, кваліфікацыі, пачуццю адказнасці);
- права на свабоду службовых паводзін, учынкаў, дзеянняў кіраўніка або радавога супрацоўніка арганізацыі не толькі ў рамках заканадаўства, але і ў межах, якія не парушаюць свабоду іншых кіраўнікоў або радавых супрацоўнікаў;
- справядлівасць у набыцці паўнамоцтваў, адказнасці, права распараджацца рэсурсамі розных відаў, у вызначэнні тэрмінаў выканання работ і г.д.;
- справядлівасць пры передачы сродкаў і рэсурсаў, а таксама правоў, прывілеяў і льгот;
- максімум прагрэсу (дзеянні супрацоўніка або арганізацыі ў цэлым этычныя, калі яны спрыяюць развіццю арганізацыі, не парушаючы пры гэтым існуючых этычных нормаў).

Падсумоўваючы ўсё сказанае, можна адзначыць, што значэнне прафесійнай этыкі ў цяперашні час цяжка пераацаніць. Ігнараванне яе ў любым выглядзе працоўнай, службовай і прафесійнай дзейнасці будуць мець негатыўныя наступствы і з'яўляцца перашкодай на шляху дасягнення поспеху.

**Спіс выкарастаных крыніц**

1. Браим И.Н. Культура делового общения: Учеб. / И.Н. Браим. – Мн.: ИП «Экоперспекимва», 2000. – 174 с.

УДК 811.161.3

## ПРАЎДА І МУЖНАСЦЬ ТАЛЕНТУ Ў ТВОРЧАСЦІ В. БЫКАВА

*Студэты – Паўшок П.В., 86 э, 1 курс, АЭФ;*
*Яўхута У.А., 19 рпт, 1 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Смалянка Г.А., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя**. «У артыкуле аналізуецца праўда і мужнасць таленту ў творах В.Быкава, разглядаецца чалавечая стойкасць перад сілай абставін».

**Ключавые словы:** творчасць, вайна, чалавечая стойкасць, мужнасць.

Мінула 75 год з Дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, а яна не адпускае нашы думкі. Мала ўжо засталося ўдзельнікаў той вайны, але з падзеямі знаёмімся чытаючы творы пісьменнікаў-удзельнікаў баёў. Вось і Васіль Быкаў з упартай паслядоўнасцю працягваў “ваяваць” у сваіх

творах. Ваеннае мінулае ў аповесці “Жураўліны крык” ажывае максімальна праўдзіва, рэальна, ва ўсёй жорсткай будзённасці. Вайна – боль, смерць, паражэнне, перамога над сваёй слабасцю і ворагам – чырвонай ніткай прасякае аповесць.

Шэсць чалавек пакінуты прыкрываць адступленне батальёна на пераездзе. Усе шасцёра бліжэй за ўсіх да той злавеснай сілы, якая ідзе з захаду і топча сваімі бруднымі ботамі нашу Беларусь. Батальён адступае, а яны засталіся – загад і абавязак – хоць усё гаворыць і патрабуе не чакаць, адыходзіць, пакуль можна….

Уся аповесць складаецца з лёсаў шасці  байцоў, у якіх розны лёс, звычкі, характар. Але аб’яднаны адным загадам. Спачатку цяжка вызначыць сапраўднага героя, але на працягу чытання адпадаюць Яўсееў і Пшанічны – здраднікі. Адзін за адным гінуць: сумленны інтэлігент Фішар, і здаравяка старшыня Карпенка, і беспакойны Свіст. У акопе астаецца самы малады, але страшэнна пастарэлы за адны суткі Глечык. Ён не збаяўся стрэліць у здрадніка Аўсеева, да апошніх хвілін падтрымліваў камандзіра, прыціснуў да сябе адзіную гранату і з захапленнем слухаў клёкат пралятаючага жураўлінага кліна. Адна з птушак адстала і, губляючы сілы, упарта рухалася наперад. Вось такая ж прага да жыцця ахоплівала і Глечыка.

Галоўнае – чалавечая стойкасць перад сілай абставін, гатоўнасць застацца чалавекам, нягледзячы ні на што.

Аўтару заўсёды важна, каб чытач адчуў па магчымасці ўсё “надвор’е” вайны: холад, голад, боль, страх, сорам і адчай паражэнняў, вострае пачуццё перамогі над страхам смерці і над ворагам, любоў і нянавісць, унутраныя слёзы болю ці бязмернай радасці. У творах В.Быкава чытач як на яве адчувае сябе побач з байцамі, спазнае іх боль і непрымірымасць да фашызму, да подласці, здрадніцтву, баязлівасці, кар’ерызму. Вось чаму аблічча вайны ў аўтара такое жорсткае: ні адзін бой не падобны на другі, бо гэта заўсёды пытанне аб жыцці і смерці. Між тым у гэтай жорсткасці баёў не прытупілася ў нашых людзях пачуццё дабрыні, справядлівасці да ўсяго харошага, да кахання. Менавіта праз суседства лірычнай стыхіі і суровай сапраўднасці канцлагеру і болю правёў нас В.Быкаў у аповесці “Альпійская балада”. Гнаныя сабакамі і фашыстамі на матацыклах у аўстрыйскіх Альпах сустрэліся беларус Іван Цярэшка і італьянка Джулія. На працягу некалькіх дзён яны прабіраліся па горных каменных шляхах сярод снегу і кветак да перавалу, дзе партызаны і свабода. Але лёс выбраў другое: Іван загінуў, а Джулія засталася жывой. Праз некалькі гадоў яна напісала ўдзячнае пісьмо землякам Івана з Рыма.

А потым другія творы: “Сотнікаў”, “Трэцяя ракета”, “Абеліск”, “Здрада” і іншыя. І ўсё вайна, жах і боль, смерць.